ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел бібліятэказнаўства

# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*Інфармацыйнае паведамленне*



МАЙ – ЧЭРВЕНЬ

Віцебск 2014

ГУ “ВИТЕБСКАЯ ОБЛАСТНАЯ БИБЛИОТЕКА ИМ. В. И. ЛЕНИНА”
Отдел библиотековедения

# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

## Май–чэрвень

*Інфармацыйнае паведамленне*

ВІЦЕБСК
2014

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *А. М. Васілеўская*
Рэдактар *В. М. Нявейкава*
Адказны за выпуск *А. І. Сёмкін*

**Культурнае** жыццё Віцебскай вобласці : май–чэрвень : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна», Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Васілеўская]. – Віцебск, 2014. – 31 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна», 2014

# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**Май–чэрвень**

*Інфармацыйнае паведамленне*

Складальнік **Васілеўская** Алена Мікалаеўна
Адказны за выпуск А. І. Сёмкін
Камп’ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна»
210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а
E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by

*МЕРАПРЫЕМСТВЫ, ЯКІЯ НЕ ЎВАЙШЛІ Ў ПАПЯРЭДНІ ВЫПУСК*

З 25 па 27 красавіка ў г. Кастанай (Казахстан) прайшоў XII Міжнародны конкурс вакалістаў "Залаты мікрафон". Дзесяцігадовы навучэнец гімназіі № 1 г. Віцебска *Улад Старчанка* заваяваў дыплом лаўрэата II прэміі.

*Витебский проспект. – 2014. – 22 мая. – С. 2.*



**ЗМЕСТ**

**ПРАДМОВА**……………………………………………………………….4

**ХРОНІКА ПАДЗЕЙ**

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці: інфармацыйнае паведамленне……………………………………………………………..5

## ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх, раённых газет Віцебскай вобласці і іх электронных версій за перыяд з 1 мая па 30 чэрвеня 2014 года. «Хроніка падзей» таксама ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім АМЦНТ, аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Міёрскага райвыканкама, РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна, Браслаўскай, Верхнядзвінскай, Віцебскай, Гарадоцкай, Докшыцкай, Дубровенскай, Лепельскай, Лёзненскай, Пастаўскай, Полацкай, Ушацкай, Чашніцкай, Шаркаўшчынскай, Шумілінскай раённымі сеткамі бібліятэк, Віцебскай і Наваполацкай гарадскімі сеткамі бібліятэк.



*МУЗЫКА*

Абласная філармонія адзначыла сваё 25-годдзе вечарамі музыкі на адкрытым паветры ў праекце “Пять вечеров с филармонией”, пачынаючы з **25 мая**. Гэта канцэрты сімфанічнай музыкі і вечар нацыянальнага мастацтва.

*ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ*

**12 мая** калектыў Беларускага тэатра “Лялька” са спектаклем для дарослых “Дзядзька Ваня и сястры тры” стаў удзельнікам ІІ Міжнароднага фестывалю тэатраў лялек “Куклы над Нёманом” у г. Гродна. **16 мая** творчая група пераехала ў Мінск, дзе прыняла ўдзел у Міжнародным фестывалі тэатраў лялек.

*Витебский проспект. – 2014. – 22 мая. – С. 2.*

**22 мая** Нацыянальны тэатр імя Якуба Коласа запрасіў на прэм’еру шэкспіраўскай п’есы “Ромео и Джульетта” ў пастаноўцы расійскага рэжысёра *В. Беляковіча*.

*Витебские вести. – 2014. – 20 мая. – С. 8.*

Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я. Коласа прыняў удзел у ХХІ Міжнародным фестывалі “Славянскія тэатральныя сустрэчы” (г. Бранск, Расія) з трагікамедыяй “Пахавайце мяне за плінтусам” П. Санаева ў пастаноўцы *В. Анісенкі*.

*Витебские вести. – 2014. – 3 июня. – С. 5.*

**8 чэрвеня** ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Я. Коласа адбыўся прэм’ерны паказ драмы *Андрэя Іванова* “Это все она” ў пастаноўцы рэжысёра *Аляксандра Марчанкі*.

Давіда Сімановіча.

*Витебские вести. – 2014. – 12 мая. – С. 22.*

## МАСТАЦТВА

*ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА*

Перфоманс генеральнага дырэктара Нацыянальнага Мастацкага музея Беларусі *Уладзіміра Пракапцова* прайшоў у г. Віцебску **19 мая** каля Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.

З **21** па **23 мая** ў КЗ “Віцебск” адбыўся ХХ конкурс-выстаўка візуальнага мастацтва студэнтаў мастацкіх спецыяльнасцей вышэйшых навучальных устаноў “Арт-Сесія”. Удзел у конкурсе прынялі студэнты з Беларусі, Германіі, Латвіі, Мексікі і Расіі.

*http://www.gck.by/category/news*

У **чэрвені** ў Віцебскім цэнтры сучаснага мастацтва экспанавалася выстаўка графікі *Валерыя Чукіна*.

*Витебские вести. – 2014. – 12 июня. – С. 21.*

У культурна-гістарычным комплексе “Залатое кальцо горада Віцебска **«**Дзвіна**»**” **5 чэрвеня** адкрылася выстаўка работ мастака *Уладзіміра Вальнова* “Время. Судьба”.

Экспазіцыя ў жанры анімалістыкі адкрылася ў Мастацкім музеі г. Віцебска ў чэрвені (скульптура, жывапіс і графіка). Арт-праект “ZOOparking «Ноев ковчег/2»” з’яўляецца працягам доўгатэрміновага маштабнага праекта. Ініцыятарам стварэння выстаўкі, прысвечанай жывёлам, стаў Алег Кастагрыз.

*Витебские вести. – 2014. – 3 июня. – С. 21.*

*КІНАМАСТАЦТВА*

Да пачатку лета УП “Кінавідэапракат” Віцебскага аблвыканкама зрабіла падарунак для кінаманаў паўночнай сталіцы. У аднаўленай зале на 50 месцаў на другім паверсе Дома кіно адбыўся першы кінасеанс.

*Витебские вести. – 2014. – 14 июня. – С. 16.*





# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

## КУЛЬТУРА

### АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

За выдатныя дасягненні ў прафесійнай дзейнасці, значны асабісты ўклад у развіццё і прымнажэнне духоўнага і інтэлектуальнага патэнцыялу, культурнай спадчыны беларускага народа *Раманоўская Марына Генадзьеўна*, намеснік генеральнага дырэктара па спецыяльных праектах Цэнтра культуры “Віцебск”, узнагароджана медалём Францыска Скарыны.

*http://www.gck.by/2014/06/6665*

**23 мая** кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з таленавітай моладдзю краіны. Юныя таленты атрымалі пасведчанні, нагрудныя знакі, дыпломы. Сярод іх і фіналістка дзіцячага тэлевізійнага музычнага конкурсу “Я пою!” *Віка Арлова* з г. Оршы.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 3 июня. – С. 3.*

За значны асабісты ўклад у развіццё культуры і міжнароднага супрацоўніцтва, актыўны ўдзел у грамадскай дзейнасці Ганаровай граматай Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта ўзнагароджана *Падаляк Алена Міхайлаўна*, дырэктар дзяржаўнай канцэртнай установы “Віцебская абласная філармонія”.

*Витебские вести. – 2014. – 3 июня. – С. 3.*

За шматгадовую плённую працу, высокае прафесійнае майстэрства, значны асабісты ўклад у развіццё беларускага тэатральнага мастацтва Ганаровай граматай Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта ўзнагароджаны *Анісенка Валерый Данілавіч*, дырэктар – мастацкі кіраўнік дзяржаўнай установы “Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа”.

*Витебские вести. – 2014. – 7 июня. – С. 3.*

У **чэрвені** адбылася трэцяя сесія раённага Савета дэпутатаў Верхнядзвінскага раёна, на якой было разгледжана пытанне "Аб мерах па паляпшэнні абслугоўвання насельніцтва ўстановамі культуры Верхнядзвінскага раёна і ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей". Была звернута ўвага на неабходнасць умацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы галіны, стварэння раённага музея, аднаўленне РДК і шэрагу сельскіх культурных цэнтраў, прасоўванне важнейшых культурных праектаў і інш.

*Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 2014. – 6 чэрв. – С. 1–2.*

**8 мая** ў абласным цэнтры адбылося ўрачыстае пасяджэнне і святочны канцэрт "Той великою весной…", прысвечаныя **Дню Перамогі** і **70-годдзю вызвалення Беларусі**. **9 мая** на плошчы Перамогі і ў парку Пераможцаў прайшлі канцэртна-забаўляльныя праграмы, у культурна-гістарычным комплексе "Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна»" – свята "И выстояли, и победили" і інш.

Урачыстае адкрыццё трох новых помнікаў адбылося ў г. Оршы 9 мая ў Парку Герояў. Дзве савецкія дывізійныя супрацьтанкавыя пушкі часоў Вялікаў Айчыннай вайны і баявую машыну дэсанта, на якой нашы землякі выконвалі інтэрнацыянальны доўг у Афганістане, аршанцы атрымалі ў падарунак ад Міністэрства абароны Беларусі і ўстанавілі на пастаменты. 69-годдзю Вялікай Перамогі ў г. Полацку было прысвечана ўрачыстае адкрыццё памятнага знака Герою Савецкага Саюза Паўлу Купрыянаву на станцыі Адамава Баравухскага сельсавета, патрыятычная акцыя "И пламя не гаснет живое", фінал творчага праекта "Мы поём ваши песни", ваенна-патрыятычная гульня "Зарница" і г. д. Супрацоўнікі Глыбоцкага гісторыка-этнаграфічнага музея падрыхтавалі да свята Перамогі фільм "Мы помним", заснаваны на рэальных фактах і дакументальных крыніцах. У рамках святкавання 9 Мая артысты Бігосаўскага СДК пабывалі на "Встрече старых друзей" у пасёлку Індра Краслаўскага раёна Латвіі і выступілі перад мясцовымі ветэранамі.

**11 мая** ў г. Віцебску каля помніка "Ордэн Перамогі" прайшло





У абласным цэнтры ў **маі** адкрылася адноўленая экспазіцыя "Памяти патриотов Витебщины", якая знаходзіцца ў будынку па вуліцы Крылова.

*Витебские вести. – 2014. – 8 мая. – С. 22*

Да **22 мая** ў віцебскім Мастацкім музеі экспанавалася выстаўка работ удзельнікаў абласнога конкурсу "Сочи. Олимпийская история белорусов".

*Витебские вести. – 2014. – 8 мая. – С. 23.*

Абласны краязнаўчы музей далучыўся да міжнароднай акцыі "Ноч музеяў". **17 мая** мерапрыемствы ў рамках акцыі прайшлі ва ўсіх філіялах. У музеі-сядзібе І. Рэпіна "Здраўнёва" яны былі прысвечаны 170-годдзю з дня нараджэння мастака. У віцебскай ратушы адкрылася выстаўка "Рарытэты музея", адбыўся паказ калекцыі касцюмаў "Віцебск,", тэатралізаваных мініяцюр на тэмы Вялікай Айчыннай вайны, спектакля "Трыбунал" і інш. У Мастацкім музеі – адкрыццё выстаўкі вышыўкі XIX стагоддзя "Женских рук изящное творенье". Тут таксама можна было ўбачыць тэатралізаваныя кампазіцыі "Ожившие картины", паслухаць рамансы ў выкананні артыстаў абласной філармоніі. Супрацоўнікі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка прысвяцілі свята тэме дзяцінства, бо адзіны ў краіне Дзіцячы музей Полацка адзначае 10-годдзе. У Музеі беларускага кнігадрукавання адбылося мерапрыемства "У музеі здымалася кіно" і прэзентацыя дзіцячага фільма "Рыжык у Залюстрэччы".

*Витебские вести. – 2014. – 15 мая. – С. 23.*

Фотавыстаўка "Витебск: портрет на фоне времени", якая ахоплівае перыяд гісторыі г. Віцебска з 1860-х і да апошніх гадоў, адкрылася **13 чэрвеня** ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі.

**14–15 чэрвеня** даследчыкі з Беларусі, Расіі, Германіі і Японіі прынялі ўдзел у XXIV Міжнароднай навуковай канферэнцыі. У гэтым годзе яна была прысвечана памяці старшыні Шагалаўскага камітэта паэта

*бібліятэка імя Е. Лось сумесна з ДШМ і РДК*); віртуальная вандроўка “О той земле, где ты родился” (*дзіцячая бібліятэка*), а таксама прэзентацыя праграмы летняга чытання “З кнігай у свет прыроды”, распрацаванай бібліятэкарам *Плінскай сельскай бібліятэкі* Г.М. Кашненка і інш.

***Чашніцкая раённая сетка публічных бібліятэк***

У рамках марафона ваеннай кнігі “Вайна глядзіць праз кніжныя старонкі” супрацоўнікі ДУК “Чашніцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” правялі адначасовую акцыю “Чытаем дзецям аб вайне”.

У чэрвені супрацоўнікі *Новалукомльскай дзіцячай бібліятэкі* прапанавалі чытачамі пазнавальную праграму “Лето в корзинке”.

***Шаркаўшчынская раённая сетка публічных бібліятэк***

Да Дня Перамогі прайшоў урок міру “Старонкі гісторыі” (*Жукоўшчынская сельская бібліятэка*).

**8 мая** Ваенна-гістарычны альманах “Вспомним всех поименно… Это нужно живым” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

***Шумілінская раённая сетка публічных бібліятэк***

**16 мая** Экалагічная вечарына “Беражы свой дом, сваю планету”, прысвечаная Міжнароднаму дню зямлі (*Башнёўская сельская бібліятэка*).

**22 мая** Тэатралізаванае прадстаўленне па казках А.С. Пушкіна “У казцы мудрасць жыве” (*гарпасялковая бібліятэка “Дабееўскі мох”*).

**25 мая** Конкурсна-гульнёвая праграма “Пусть звенит детский смех”, прысвечаная Міжнароднаму дню абароны дзяцей (*Слабадская сельская бібліятэка*).



ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае **Дню Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь**, а на плошчы Перамогі – канцэртна-забаўляльная праграма.

**27–29 чэрвеня** ў Віцебску праходзілі ўрачыстасці, прысвечаныя **Дню горада**. Абласны цэнтр святкаваў сваё 1040-годдзе. У гэтыя дні прайшло амаль паўсотні мерапрыемстваў: урачыстае пасяджэнне і канцэрт у Летнім амфітэатры, сустрэча з паэтамі і пісьменнікамі Віцебшчыны “Віцебск літаратурны”, гарадская выстаўка кветак, пленэр юных мастакоў “Віцебскі вернісаж”, свята газеты “Віцьбічы”, ваенна-гістарычнае тэатралізаванае прадстаўленне, прысвечанае 70-годдзю вызвалення Віцебска, канцэрт патрыятычнай песні іншыя мерапрыемствы. **27 чэрвеня** каля Уваскрасенскай царквы быў адкрыты помнік князю Віцебскаму (1320–1345 гг.), Вялікаму князю Літоўскаму (1345–1377 гг.) Альгерду. Конны помнік князю створаны мінскім скульптарам *Сяргеем Бандарэнкам* і адліты на полацкім прадпрыемстве “Тэхналіт”. **28 чэрвеня** на вуліцы Політэхнічнай, 2 была адкрыта мемарыяльная дошка ў гонар народнага артыста СССР кампазітара Марка Рыгоравіча Фрадкіна, 100-годдзе якога адзначаецца ў гэтым годзе.

*КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ*

Юныя артысты Верхнядзвінскага раёна выйшлі ў фінал Міжнароднага музычнага конкурсу для дзяцей і юнацтва “Жемчужина Даугавы” (Латвія). Гэта салістка дзіцячай эстраднай студыі “Переменка” РДК *Ганна Грыгор’ева*, салістка дзіцячай узорнай студыі “Жаворонки” *Дзіна Аўзін* і ўдзельніца дзіцячага кружка эстрадных спеваў “Голоса XXI века” Запруддзеўскага СДК *Кацярына Яскевіч*.

*Витебские вести. – 2014. – 22 мая. – С. 23.*

**6–8 чэрвеня** творчая дэлегацыя Віцебскай вобласці прыняла ўдзел у **X юбілейным Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур** у г. Гродна. У мерапрыемстве ўдзельнічалі вакальны гурт “Вадаграй” Бароўскага Цэнтра культуры і вольнага часу Лепельскага

раёна, ансамбль “Цыганскія вогнішчы” з г. Віцебска, народныя клубы нацыянальных культур “Дружба” Іллюшынскага СДК Ушацкага раёна і майстроў ласкутнага шыцця “Рошва” Полацкага раённага Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур і іншыя, усяго каля 50 чалавек. У рамках фестывалю былі арганізаваны святы нацыянальнага харэаграфічнага і тэатральнага мастацтва, шоу-прэзентацыя нацыянальнага касцюма, гульнёвыя і юмарыстычныя праграмы. Усе прадстаўнікі вобласці вярнуліся з дыпломамі лаўрэатаў.

*Віцебскі АМЦНТ*

З **19** па **22 чэрвеня** ў г. п. Акцябрскі Гомельскай вобласці прайшоў **VII рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва “Берагіня”**. У ім прымаў удзел народны фальклорны калектыў “Крыніца” Янкавіцкага сельскага Дома культуры Расонскага раёна пад кіраўніцтвам Н. Кавалёвай. Ён адзіны з аўтэнтычных гуртоў прадстаўляў Віцебшчыну.

*http://www.rossonka.by/catnews.php?linktheme=3*

Калектывы Цэнтра культуры “Віцебск” (народны тэатр песні і музыкі “Прасторы”, шоу-група “Инспектор ЖУFF”, салісты С. Дзмітрачэнка і С. Якубенка, заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль танца “Лявоніха”, а таксама клуб гістарычнай рэканструкцыі “Варгенторн”) **7–8 чэрвеня** прынялі ўдзел у свяце “Мой город Даугавпилс”, прысвечаным 738-годдзю населенага пункта.

*http://www.gck.by/2014/06/*

## КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

*КЛУБНАЯ СПРАВА*

**12–16 мая** ў Віцебскім абласным цэнтры павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў устаноў культуры для кіраўнікоў аматарскіх тэатральных калектываў вобласці прайшлі базавыя курсы на тэму “Развіццё аматарскага тэатра ў сучасных умовах”.



*імя Ф. Скарыны*).

У гэтым годзе *цэнтральная бібліятэка імя Ф. Скарыны* адзначае 95-годдзе. У рамках святочных мерапрыемстваў, што адбываюцца з гэтай нагоды, **3 чэрвеня** ў бібліятэцы прайшла “Бібліяноч”.

*http://polack-news.ru/novosti/gorodskaja-zhizn/biblionoch.html*

**23 мая** Урок мужнасці для навучэнцаў Полацкага кадэцкага вучылішча “Старонка той страшнай вайны”, прысвечаны 70-годдзю вызвалення г. Полацка ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (*бібліятэка імя Я. Купалы*).

### *Сенненская раённая сетка публічных бібліятэк*

Да Дня Перамогі ў бібліятэках сістэмы былі праведзены наступныя мерапрыемствы: фотадакументальная кніжная выстаўка “Вечны і непаўторны подзвіг Айчыны” (*цэнтральная раённая бібліятэка*), вечар сустрэча “Зямны паклон вам, героі” (*дзіцячая раённая бібліятэка*), літаратурна-музычная кампазіцыя “Святлом павагі ваш сон хаваем” (*Алексінічаўская сельская бібліятэка-клуб*), вечар памяці “Мужества вечный огонь” (*Янкоўская сельская бібліятэка*) і інш.

### *Ушацкая раённая сетка публічных бібліятэк*

У біліятэках раёна ў **маі** прайшлі мерапрыемствы: літаратурны вечар “Мой верш – ад бароў духмяных”, прысвечаны творчасці ўшацкай паэтэсы Т. Барадзёнак, з удзелам калектываў мастацкай самадзейнасці раёна “Матырынская спадчына”, “Дубравушка” (*цэнтральная раённая бібліятэка імя Е. Лось*); сямейнае свята “Мама, папа, я…” (*дзіцячая бібліятэка*); урокі памяці “Был трудный бой…” (*Сарочынская сельская біліятэка*) і “Страницы той страшной войны” (*Арэхаўская сельская бібліятэка*).

У **чэрвені** ў бібліятэках сістэмы адбыліся наступныя мерапрыемствы: літаратурны вечар “Я перад вамі з памяццю сваёй”, прысвечаны 90-годдзю з дня нараджэння В. Быкава (*цэнтральная раённая*

прапануй іншаму” (*Дрыгучская сельская бібліятэка*), урок мужнасці “Памяць далекай вайны” (*Ідолтаўская сельская бібліятэка*), “Их славе память предков верна” (*Туркоўская сельская бібліятэка*) і інш.

**12 чэрвеня** на базе *Язненскай сельскай бібліятэкі* адбыўся выязны семінар сельскіх бібліятэкараў раёна “Сельская бібліятэка: ідэі, падыходы, рашэнні”.

Выстаўка работ інвалідаў па зроку “З надзеяй у будучыню” (бісер, разьба па дрэве, швейныя вырабы) (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

***Пастаўская раённая сетка публічных бібліятэк***

**8 мая** Літаратурна-музычная вечарына “Радзіма. Радасць. Боль. Надзея” з удзелам навучэнцаў Пастаўскага прафесійнага каледжа (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**25 мая** Пасяджэнне аматарскага клуба “Парыжанка” з запрашэннем праграмы Першага беларускага канала “Белорусское времечко” “Женская судьба” (*Парыжская сельская бібліятэка*).

**13 чэрвеня** Музычна-паэтычная вечарына “Паэтаў спеўная душа” з удзелам членаў аматарскага паэтычнага літаратурнага аб’яднання “Ветразі надзеі” з г. Браслава і галоўнага рэдактара часопіса “Вожык” Ю.Ф. Зарэцкай (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**18 чэрвеня** Патрыятычны вечар “Па дарогах вайны” (*Варапаеўская дзіцячая бібліятэка*).

***Полацкая раённая сетка публічных бібліятэк***

**6 мая** Сустрэча з трэнерам Наваполацкай каманды “Химик–СКА” С.Ю. Задарожным “Хоккей – наша игра” (*цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. Скарыны*).

**8 мая** Урок памяці “Знать, чтобы помнить, помнить, чтобы гордиться…” для вучняў 4–8-х класаў (*Саланіцкая сельская бібліятэка*).

**15 мая** Сустрэча з *айцом Уладзімірам* “Семья – малая церковь”, прысвечаная Міжнароднаму дню сям’і (*цэнтральная раённая бібліятэка*



*Віцебскі АМЦНТ*

**16 мая** ў г. Талачыне адбыўся раённы конкурс культарганізатараў.

*РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна*

Свята дзіцячай народнай творчасці “Кола будучыні” правялі ў маі ў Верхнядзвінскім РДК. Удзел у мерапрыемстве прынялі дзіцячы фальклорны гурт “Галасы вякоў” Сенькаўскага сельскага клуба, удзельнікі аматарскага аб’яднання “Расіца” Бігосаўскага СДК і фальклорнага гурта “Вяселіца” Каханавіцкага СДК, артысты з Боркавіцкага СДК, якія прадставілі “Боркавіцкія вячоркі”, а таксама вакальны гурт “Маладыя галасы” і клуб выхаднога дня “Светлячок” Антонаўскага СДК, калектыў “Вяргіні” Сар’янскага СДК, вакальныя гурты “Соловушки” з Шайцераўскага СДК і “Чабарок” з Бігосаўскай ДШМ і інш.

*http://www.d-p.by/2014/05/nam-zastalasya-spadchyna/#more-9008*

**18 мая** ў КЗ “Віцебск” адбыўся рэспубліканскі конкурс сярод ансамбляў па спартыўных бальных танцах. Арганізатар мерапрыемства – узорны ансамбль спартыўнага бальнага танца “Фэст” Цэнтра культуры “Віцебск”.

**3 чэрвеня** ў Глыбоцкім ГДК прайшоў абласны семінар па нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыне Віцебскай вобласці, у якім прынялі ўдзел метадысты РАМЦ па фальклоры, кіраўнікі фальклорных калектываў і спецыялісты з 15 раёнаў вобласці. У межах семінара адбылося наведванне дзіцячай мастацкай школы імя Я. Драздовіча і прагляд прэзентацыі работы клуба аматараў беларускай нацыянальнай кухні “Кумачкі” Гатаўшчынскага СДК Глыбоцкага раёна.

*Віцебскі АМЦНТ*

Горад Наваполацк з **10** па **15 чэрвеня** адзначаў 56-ты дзень нараджэння, прысвяціўшы святочныя мерапрыемствы Году гасціннасці і працоўным дасягненням гараджан. Навапалачане сустракалі гасцей з дзесяці гарадоў-пабрацімаў, якія даслалі свае дэлегацыі. Адбыліся выступленні самабытных харэаграфічных калектываў “Велрейс” і “Залите” з г. Юрмалы (Латвія).

*http://novaya.by/2014/06/*

*Витебские вести. – 2014. – 17 июня. – С. 5.*

**21 чэрвеня** ў аграгарадку Мазалава Віцебскага раёна прайшло традыцыйнае раённае мерапрыемства “Мазалаўскі карагод гульняў”. Упершыню на свята бала запрошана дэлегацыя з аднайменнага – Мазалаўскага – сельсавета Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці.

*Витебские вести. – 2014. – 17 июня. – С. 8.*

*ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ*

**Абласное свята-конкурс духавых аркестраў і ансамбляў барабаншчыц “Виват оркестр!”** прайшло **3–4 мая** ў г. Лепелі і было прысвечана 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У гэтым годзе ўпершыню ўдзел у ім прынялі замежныя госці – народны эстрадны аркестр Смаленскага дзяржаўнага інстытута мастацтваў Расійскай Федэрацыі. Сярод дзіцячых калектываў I месца было прысуджана духавому аркестру СШ № 8 г. Оршы, II месца – Лепельскай ДШМ, III месца – Аршанскай ДШМ № 1 і Лепельскаму раённаму цэнтру дзяцей і моладзі. Сярод народных духавых аркестраў лепшым прызнаны народны духавы аркестр Наваполацкага ГДК, на другім месцы музыканты ДУК “ГЦК г. Орша” і 19-й гвардзейскай асобнай брыгады з пасёлка Заслонава Лепельскага раёна. Гран-пры атрымалі госці з г. Смаленска.

*Віцебскі АМЦНТ*

*Витебские вести. – 2014. – 6 мая. – С. 1, 8.*

**23–25 мая** ў г. Полацку адбыўся **V фестываль сярэднявечнай культуры “Рубон”**. У ім прынялі ўдзел больш за 300 чалавек з Беларусі, Літвы, Латвіі, Эстоніі і Расіі. У гэтым годзе ў праграме фестывалю былі і пляцоўкі нацыянальнай кухні, музейнай этнаграфіі, у ліку навінак – кулінарны фестываль, а таксама рэканструкцыя штурма замка сярэдневяковымі рыцарамі. Як і раней, удзельнікі ”Рубона” прадставілі



наследство живым» (*Бароўская сельская бібліятэка сумесна з ЦКіД*), літаратурна-музычная кампазіцыя “Жди меня…” (*Юркоўшчынская сельская бібліятэка*) і інш.

**13 і 25 чэрвеня** Віртуальныя вандроўкі для людзей з абмежаванымі магчымасцямі “Прогулки по планете: Беларусь” і “Прогулки по планете: Болгария” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

У дзіцячай бібліятэцы ў рамках праграмы летніх чытанняў “Лето, книга, я – друзья!” прайшлі наступныя мерапрыемствы: гульнёвая праграма “В гости к лету”, экалагічнае свята “Птичьи странички”, забаўляльная праграма “Тридцать три секрета солнечного лета”, пазнавальная гадзіна “Что за чудо этот чай” і інш.

***Лёзненская раённая сетка публічных бібліятэк***

**8 мая** Літаратурная гадзіна “Великая Отечественная война глазами писателей” для падлеткаў (*сельская бібліятэка аграгарадка Бабінавічы*).

**19 мая** Прэзентацыя праекта “Читаем вместе о войне” (*дзіцячая бібліятэка*).

**1 чэрвеня** Адкрыццё летняга чытальнага дворыка (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**20 чэрвеня** Дзень ваеннай кнігі “Книгопутешествие в 1944-й год”, прысвечаны аперацыі “Багратион” (*дзіцячая бібяліятэка*).

***Міёрская раённая сетка публічных бібліятэк***

У бібліятэках Міёрскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы праводзіліся наступныя мерапрыемствы, прысвечаныя Дню Перамогі: Дні памяці “З той далёкай вайны” (*Міёрская дзіцячая бібліятэка*), “Память патрэбна жывым” (*Дзісненская гарадская бібліятэка*), “Хотим мира – помним о войне” (*Волкаўшчынская сельская бібліятэка*), гадзіна мужнасці “Няхай жывыя памятаюць і пакаленні ведаюць” (*Далгінаўская сельская бібліятэка*), дзіцячы чытальны марафон “Прачытай кнігу пра вайну і

*Верамееўшчына*), вечар сямейнага адпачынку "Отдыхаем всей семьей" (*сельская бібліятэка аграгарадка Сіпішчава*) і інш.

Сусветнаму дню без тытуня была прысвечана віктарына "Я никогда не буду курить!" (*сельская бібліятэка аграгарадка Дабрынь*) і гутарка "Сломай сигарету, пока она не сломала тебя!" (*сельская бібліятэка аграгарадка Станіслвова*) і інш.

Дзіцячае свята "Падарожжа па казках А.С. Пушкіна" (*сельская бібіятэка аграгарадка Буда сумесна з СДК*).

Гадзіна мужнасці да 70-годдзя вызвалення Дубровенскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў "Где же вы теперь, друзья-однополчане?" (*Дзяцельская сельская бібліятэка-клуб*).

***Лепельская раённая сетка публічных бібліятэк***

**14 мая** Віртуальнае падарожжа "Прагулкі па планеце" для людзей з абмежаванымі магчымасцямі (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**14 мая** У галерэі "Арт-Лепель" прайшло адкрыццё выстаўкі работ навучэнцаў кружка "Квілінг" ГДК.

**20 мая** адбыўся тэматычны семінар для бібліятэкараў раёна "Выхаваць патрыёта: традыцыі, праблемы, іх вырашэнне ў бібліятэчным фармаце". У мерапрыемстве прынялі ўдзел ваенны камісар Лепельскага ваеннага камісарыята, настаўнік гісторыі Слабадской СШ, кіраўнік краязнаўчага клуба "Нашчадкі", першы сакратар БРСМ Лепельскага раёна (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**22 мая** Скайп-канферэнцыя "Семья – моя опора" з удзелам людзей з абмежаванымі магчымасцямі з Лепельскага раённага таварыства інвалідаў і расійскага маладзёжна-інфармацыйнага клуба "Ромашка" з г. Балахна Ніжагародскай вобласці (Расія) (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

У рамках раённай акцыі "Прочитай книгу о войне – и стань ближе к подвигу" ў бібліятэках адбыліся вечар-успамін (*Баброўская сельская біліятэка-музей імя Я. Мароза*), тэматычная праграма «Память погибшим,



гістарычныя эпохі ў развіцці Полаччыны.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 5 июня. – С. VIII.*

З **31 мая** па **1 чэрвеня** прайшло **Міжнароднае свята традыцыйнай культуры "Браслаўскія зарніцы-2014"**. Сёлетні фестываль прымеркаваны да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Адным з галоўных пунктаў фестывальнай праграмы стаў конкурс "Браслаўская харавая асамблея", у якім прынялі ўдзел 15 лепшых харавых калектываў вобласці і народны хор рускай песні КДЦ "Пушкінскія горы" Пскоўскай вобласці (Расія). Дыпломамі першай ступені ўзнагароджаны народны камерны жаночы хор гарадскога Палаца культуры г. Наваполацка (кіраўнік Г. Доўжык) і народны хор "Спадчына" Шаркаўшчынскага РДК (кіраўнік Ж. Русак), ІІ месца ў народнага ансамбля народнай песні "Славяначка" культурна-спартыўнага Цэнтра УП "Мінскае аддзяленне Беларускай чыгункі" (г. Орша) (кіраўнік Т. Шук) і народнага хору рускай песні КДЦ "Пушкінскія горы" Пскоўскай вобласці (кіраўнік М. Фёдарава), ІІІ месца заваявалі народны хор Зубоўскага СДК Аршанскага раёна (кіраўнік М. Някрасаў) і народны хор работнікаў культуры Сенненскага РДК (кіраўнік А. Паўлоўская).

*Віцебскі АМЦНТ*

*Витебские вести. – 2014. – 3 июня. – С. 5.*

**Абласны агляд-конкурс "Клубных спраў майстры"** праводзіцца ў Віцебскай вобласці ўпершыню. Заснавальнікамі конкурсу з'яўляюцца Галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама, Віцебская абласная арганізацыя Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, ДУ "Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці". У аглядзе-конкурсе прымаюць удзел творчыя работнікі ўстаноў культуры клубнага тыпу. Агляд-конкурс праходзіць у тры этапы: І – у раёнах (люты – сакавік), ІІ – занальныя адборачныя туры па трох зонах (агр. Нікіціха, г. Міёры, г. п. Бешанковічы) (красавік – май). 19 пераможцаў раённых этапаў агляду-конкурсу прынялі ўдзел у занальных адборачных турах, якія

прадугледжвалі правядзенне чатырох конкурсаў: візітоўка "Мая прафесія – мой дом", "Прыязджайце ў госці да нас", "Талент ёсць", "Майстар імправізацыі". I зона (аграгарадок Нікіціха Шумілінскага раёна, 25 красавіка): I месца – *Алена Мікалаеўна Петухова,* загадчык аддзела па працы з дзецьмі і моладдзю Наваполацкага ГДК, II месца – *Таццяна Пятроўна Кравец,* мастацкі кіраўнік Обальскага ГДК Шумілінскага раёна. II зона (г. Міёры, май): I месца – *Юлія Генадзьеўна Галяш,* дырэктар Варапаеўскага ГпДК Пастаўскага раёна, II месца – *Яўген Віктаравіч Набееў,* рэжысёр народнага тэатра Браслаўскага РДК і *Аляксей Эдуардавіч Гайдэль,* рэжысёр народнага тэатра Мёрскага РДК. III зона (г. п. Бешанковічы, май): I месца – *Антаніна Паўлаўна Марозава,* дырэктар Калінаўскага СДК Дубровенскага раёна і *Яна Анатольеўна Талкачова,* метадыст раённага Цэнтра культуры ДУК "Лёзненская цэнтралізаваная клубная сістэма", II месца – *Людміла Фёдараўна Шыпуля,* кіраўнік народнага ансамбля жартоўнай песні "Грымзолі" ДУК "Лепельскі ГДК" і *Наталля Ягораўна Сакалова,* дырэктар Капцянскага СДК Віцебскага раёна. Дыпломамі агляду-конкурсу былі таксама ўзнагароджаны наступныя ўдзельнікі занальных адборачных тураў: *Лілія Пятроўна Рэзкіна* (Гарадоцкі раён), *Любоў Міхайлаўна Бялісава* (Расонскі раён), *Вольга Аляксееўна Мацулевіч* (Ушацкі раён), *Любоў Іванаўна Марынская* (Верхнядзвінскі раён), *Святлана Леанідаўна Дзекун* (Глыбоцкі раён), *Ірына Анатольеўна Буднік* (Шаркаўшчынскі раён), *Уладзімір Пятровіч Верабей* (Аршанскі раён), *Вольга Паўлаўна Качанава* (Бешанковіцкі раён), *Валянціна Пятроўна Бельская* (Сенненскі раён), *Эма Ягораўна Багатырова* (Чашніцкі раён). III этап (фінал), пройдзе ў кастрычніку–лістападзе 2014 г. у г. Віцебску.

*Віцебскі АМЦНТ*

**14–15 чэрвеня** ў г. Паставы прайшоў **XVII Міжнародны фестываль народнай музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік"**. Горад-юбіляр, напярэдадні адсвяткаваўшы сваё 605-годдзе, гасцінна сустракаў удзельнікаў творчага форуму з розных абласцей краіны, а таксама Літвы,



**21 чэрвеня** Вечар-напамін "Мы отстояли это право – жить" (*Пальмінская сельская бібліятэка*).

**27 чэрвеня** для работнікаў бібліятэчнай сеткі раёна адбыўся выязны тэматычны семінар "Вайны свяшчэнныя старонкі навекі ў памяці людской: работа публічных бібліятэк па папулярызацыі твораў беларускага пісьменніка Васіля Быкава і фарміраванні героіка-патрыятычнай свядомасці сярод розных катэгорый насельніцтва". У рамках семінара на базе *Мяжанскай сельскай бібліятэкі* прайшоў вечар-партрэт "Подзвіг ратны – подзвіг творчы" (да 90-годдзя з дня нараджэння В. Быкава).

### Докшыцкая раённая сетка публічных бібліятэк

**21 мая** Семінар бібліятэчных работнікаў раёна "Інавацыйныя падыходы да арганізацыі вольнага часу дзяцей і моладзі ў летні перыяд". У рамках мерапрыемства прайшла прэзентацыя праграмы летняга чытання "Хто не любіць лета? Лета любяць усе!" на базе *дзіцячай раённай бібліятэкі*, паказальнае мерапрыемства па казцы К. Чукоўскага "Муха-Цакатуха" (*Барсукоўская сельская бібліятэка*).

Супрацоўнікі *Бягомльскай гарпасялковай бібліятэкі імя П. Панчанкі* да Дня Перамогі афармілі пляцоўку "Пока мы помним – мы живем", на якой прысутным былі прапанаваны віктарына "Святочная", гульня "Меткий стрелок", латарэя "На привале", кніжная выстаўка "Эти книги расскажут о войне" і інш.

### Дубровенская раённая сетка публічных бібліятэк

У бібліятэках раёна адбыліся наступныя мерапрыемствы, прысвечаныя Дню Перамогі: тэматычны вечар "Нам жить и помнить подвиги отцов и дедов" (*цэнтральная раённая бібліятэка*), урок памяці "Мне выпала честь прикоснуться к Победе" (*сельская бібліятэка аграгарадка Чырына*), літаратурна-музычная кампазіцыя "Пусть войны не будет никогда!" (*сельская бібліятэка аграгарадка Якубава*) і інш.

Міжнароднаму дню сям'і былі прысвечаны конкурсная праграма "Усё пачынаецца з сям'і" (*сельская бібліятэка аграгарадка*

**8 мая** Відэапанарама "Невычэрпнасць духу і чалавечнасці", прысвечаная падзеям Вялікай Айчыннай вайны, прэзентацыя бібліяграфічнага паказальніка "Героямі сталі на віцебскай зямлі" (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**17 мая** Дзень сямейнага адпачынку "Час чытаць сям'ёй – гэта лепшы час". У праграме: конкурс малюнкаў "Мая сям'я", выстаўка кніг "Гэтымі кнігамі захапляліся мае бацькі", выстаўка-ўспамін "Бабулін куфэрак" (*Курынская сельская бібліятэка*).

**29 мая** Юрыдычная кансультацыя "Проблемы, волнующие население" з удзелам спецыяліста гарадской калегіі адвакатаў юрыдычнай кансультацыі № 1 г. Віцебска Н.А. Емяльяненка сумесна з ПЦПІ (*Скрыдлеўская сельская бібліятэка-клуб*).

**30 мая** Супрацоўнікі *Альгоўскай сельскай бібліятэкі* прынялі ўдзел у навукова-практычнай канферэнцыі "Жывая гісторыя майго краю" ў рамках міжнароднага праекта "Падбярэзскі куфар" і свяце вескі Падбярэззе, на якім прадстаўлялі беларускую нацыянальную кухню.

***Гарадоцкая раённая сетка публічных бібліятэк***

**4 мая** Духоўная сустрэча з вучнямі нядзельнай школы Езярышчанскага храма Успення Прасвятой Багародзіцы (*Халамерская сельская бібліятэка*).

**20 мая** Трэнінг па барацьбе з курэннем і алкагалізмам "В погоне за миражом" (*дзіцячая бібліятэка*).

**21–23 мая** Акцыя "Вершы ў кішэні", прысвечаная 75-годдзю паэта, перакладчыка У. Скарынкіна (*цэнтральная раённая бібліятэка*). З гэтай жа нагоды адбыўся і паэтычны дыліжанс па навучальных установах і арганізацыях горада.

**1 чэрвеня** супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі г. Гарадка прынялі ўдзел у агульнагарадскім свяце "Обнимем детством город наш".

**15 чэрвеня** Свята паэзіі "Вераніцынская зорка" (*цэнтральная раённая бібліятэка*)



Латвіі, Эстоніі, Расіі, Славакіі, Венесуэлы, Малдовы і Грузіі. У рамках фестывалю ў выставачнай зале Дома рамёстваў праходзіла фотавыстаўка "Горад. Гісторыя. Людзі", у канцэртнай зале адбылося літаратурнае свята "Паэтаў спеўная душа", у Доме культуры выступіў дзяржаўны ансамбль песні і танца Грузіі "Аджарыя", прайшла маладзёжная акцыя "Мой горад. Мая краіна" і іншыя мерапрыемствы.

*Віцебскі АМЦНТ*

*Витебские вести. – 2014. – 19 июня. – С. 23.*

**20 чэрвеня** на тэрыторыі Купалаўскага мемарыяльнага запаведніка "Ляўкі" Аршанскага раёна прайшло **абласное свята паэзіі "Край мар маіх і думак светлых – мая Радзіма Беларусь"**, прысвечанае 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У свяце прынялі ўдзел дэлегацыя пісьменнікаў грамадскага аб'яднання "Саюз пісьменнікаў Беларусі", ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, ганаровыя госці, майстры і самадзейныя артысты Віцебшчыны. У час свята прайшлі экскурсіі ў філіяле Дзяржаўнага літаратурнага музея Я. Купалы "Ляўкі", сустрэчы з пісьменнікамі, выступленні калектываў мастацкай самадзейнасці, літаратурна-музычныя конкурсы, прэзентацыі клубаў літаратурных кірункаў, выстаўка-дэгустацыя клубаў нацыянальнай кухні, літаратурныя выстаўкі, выстаўкі вырабаў майстроў дэкаратыўна-прыкладнай творчасці, акцыя "Беларускую кнігу – беларускаму чытачу". У рамках Года гасціннасці на тэрыторыі запаведніка аршанцы абсталявалі "Лаўку гасціннасці". Цікавым момантам свята стала цырымонія закладкі капсулы з пасланнем будучаму пакаленню ад членаў грамадскага аб'яднання "Саюз пісьменнікаў Беларусі".

*Віцебскі АМЦНТ*

**21 чэрвеня** ў сядзібе-музеі Васіля Быкава ў вёсцы Бычкі Ушацкага раёна адбыліся літаратурныя чытанні, прымеркаваныя да 90-годдзя з дня нараджэння пісьменніка. Удзел у мерапрыемстве прынялі літаратары з г. Віцебска і г. Мінска, а таксама прадстаўнікі грамадскасці, госці з розных гарадоў Беларусі.

*Витебские вести. – 2014. – 21 июня. – С. 4.*

**28–29 чэрвеня** ў г. Дуброўна прайшоў **Міжнародны фестываль песні і музыкі Падняпроўя Расіі, Беларусі і Украіны “Дняпроўскія галасы ў Дуброўна”**. У фестывалі прынялі ўдзел прадстаўнікі прафесійных і аматарскіх калектываў з Беларусі, Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Славакіі і Венгрыі. У рамках фестывалю была адкрыта алея Герояў у скверы, дзе ўсталявалі помнікі дзесяці Героям Савецкага Саюза – вызваліцелям Дубровеншчыны. Упершыню ў рамках фестывалю адбыўся пленэр рэзчыкаў манументальнай драўлянай скульптуры “Майстры салаўінага краю”.

*Віцебскі АМЦНТ*

*Витебские вести. – 2014. – 26 июня. – С. 10.*

**29 чэрвеня** ў в. Перабродздзе Міёрскага раёна ў восьмы раз прайшло **свята народнай творчасці “Перабродская зорка”**. Удзел у мерапрыемстве прынялі госці з г. Смаленска – майстры народных мастацкіх промыслаў.

*Витебские вести. – 2014. – 12 июня. – С. 8.*

*БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА*

***Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна***

**5 мая** ў фае бібліятэкі адбылася выстаўка-прагляд “Планета периодики”, прымеркаваная да Дня друку Беларусі, на якой былі прадстаўлены перыядычныя выданні з фонду абласной бібліятэкі.

**7 мая** ў бібліятэцы прайшла літаратурна-музычная вечарына, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння паэтэсы Юліі Друнінай “Я родом не из детства – из войны...”, арганізаваная супрацоўнікамі агульнай чытальнай залы.

Супрацоўнікі аддзела “Электронная чытальная зала” падрыхтавалі да Міжнароднага дня сям’і тэматычны даведнік па электронных рэсурсах “Мир семьи”.

**13 мая** ў бібліятэцы прайшла прэзентацыя кнігі *Андрэя*



У рамках святкавання 70-годдзя вызвалення Беларусі адбыліся наступныя мерапрыемствы: месячнік патрыятычнага выхавання “Пусть знают и помнят потомки” (*цэнтральная раённая бібліятэка*), урок памяці “Старонкі ваеннай гісторыі Браслаўшчыны” (*дзіцячая бібліятэка*), тыдзень памяці “Память о войне священна” (*Відзаўская сельская бібліятэка*), (*Мяжанская сельская бібліятэка*), літаратурная гасцёўня па творчасці Ю. Друнінай “Я родам не з дзяцінства…” (*Барунская сельская бібліятэка*) і інш.

***Верхнядзвінская раённая сетка публічных бібліятэк***

**15 мая** Гадзіна духоўнасці “Дорогой добра” (*дзіцячая бібліятэка*).

**21 мая** Сустрэча з удзельнікамі латышскай воднай экспедыцыі (кіраўнік Арвіс Апфелбаус) па рацэ Дзвіна (*цэнтральная раённая бібліятэка).*

**29 мая** супрацоўнікі *цэнтральнай раённай бібліятэкі* прэзентавалі на сесіі дэпутатаў райвыканкама кніжную выстаўку “Верхнядзвінскі раён: старонкі гісторыі”.

**19 чэрвеня** Літаратурны вечар “Я перад вамі з памяццю сваёй” (*Боркавіцкая сельская бібліятэка*).

**20 чэрвеня** Сустрэча “В память о павших во имя живых” (*Бігосаўская сельская бібліятэка*).

**21 чэрвеня** Юбілейны вечар, прысвечаны 25-годдзю клуба “Белыя вароны”. У рамках святочных мерапрыемстваў адбылася літаратурна-музычная кампазіцыя і прэзентацыя кнігі кіраўніка клуба П.П. Квяцінскага “Отсроченное счастье” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

***Віцебская раённая сетка публічных бібліятэка***

**7 мая** Бібліядэсант “Мабільная кніга і віншаванне – ветэрану!”, акцыя з выкарыстаннем бібліобуса па абслугоўванні жыхароў в. Дыманова (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

Традыцыйна бібліятэкі сістэмы прынялі ўдзел у святкаванні Дня горада. На вуліцы Пушкіна адбылося свята кнігі “Літаратурная палітра паўночнай сталіцы”. Жыхары горада мелі магчымасць пабываць на краязнаўчай пляцоўцы “Гарадскія гісторыі”, дзе супрацоўнікамі ЦГБ імя М. Горкага былі прапанаваны кніжныя выстаўкі “Мой вечна юны старажытны горад”, віктарына “Ці ведаеце вы свой горад” і патрятычная акцыя “Выбіраем сімвал Віцебска”. На дзіцячай пляцоўцы “Мы хотим, чтоб наше лето было книгами согрето” бібліятэкамі імя С. Маршака, Я. Маўра, А. Гайдара і У. Караткевіча былі арганізаваны паэтычныя конкурсы і віктарыны “Хто прыйшоў да нас з казкі?”, “Угадай поэта – получи конфету”, прэзентацыі лепшых дзіцячых кніг.

***Наваполацкая гарадская сетка публічных бібліятэк***

**7 мая** Гадзіна-рэквіем “Шлях, паліты крывёю” да 40-годдзя адкрыцця мемарыяльнага комплексу “Прарыў” (*цэнтральная бібліятэка імя У. Маякоўскага*) .

**19 мая** Гульня-падарожжа для школьнікаў малодшых класаў “Красное лето – яркая песня природы” (*дзіцячая бібліятэка імя С. Маршака*).

**21 мая** Музычная гадзіна “Чашка чая с «Песнярами»” для членаў клуба “Еще не вечер” (*бібліятэка імя У. Караткевіча*).

***Браслаўская раённая сетка публічных бібліятэк***

**20 мая** Нарада бібліятэчных работнікаў раёна на тэму “Роля бібліятэк у патрыятычным выхаванні моладзі” з удзелам метадыста аддзела адукацыі, спорту і турызму райвыканкама *К. Сайкоўскай* і загадчыка аддзялення дадатковага выхавання ЦДТ *А. Лук’янец* (*цэнтральная раённая бібліятэка).*

У **маі** ў рамках Міжнароднага фестывалю народнай творчасці “Браслаўскія зарніцы” *цэнтральную раённую бібліятэку* наведалі прадстаўнікі дэлегацый з Кітая, Сербіі, Латвіі, Літвы і Расіі.



*Уладзіміравіча Пуртава* “Они сражались со смертью: медицина Россонского района 1941–1944”.

**15 мая** ў аддзеле дзіцячай літаратуры адбылося адкрыццё фотавыстаўкі “Будущие взрослые и бывшие дети”, на якой былі прадстаўлены работы юных чытачоў бібліятэкі.

З **5** па **8 мая** ў аддзеле дзіцячай літаратуры прайшоў Тыдзень памяці “Войны не знали мы, но все же…”, прымеркаваны да Дня Перамогі.

**20 мая** ў бібліятэцы адкрылася персанальная выстаўка заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь, члена Беларускага саюза мастакоў *Уладзіміра Пракапцова* “Струны прасторы і часу” і прайшла прэзентацыя кнігі Б. Крэпака “Владимир Прокопцов. Неудержимая квадрига жизни”.

**21 мая** супрацоўнікі сектара замежнай літаратуры правялі студэнцкую гасцёўню “На перекрестке культур”, прымеркаваную да Сусветнага дня культурнай разнастайнасці ў імя дыялога і развіцця.

**28–29 мая** ў бібліятэцы прайшоў семінар для загадчыкаў аддзелаў бібліятэчнага маркетынгу цэнтральных бібліятэк Віцебскай вобласці “Маркетынгавая арыентацыя бібліятэчнай дзейнасці”. Даклады выступоўцаў былі прысвечаны пытанням інтэграваных маркетынгавых камунікацый, сацыяльнай рэкламе і адаптацыі персанала бібліятэкі да інавацый. У рамках семінара адбыўся круглы стол “Складаючыя поспеху: PR-тэхналогіі публічных бібліятэк” і сустрэча з прадстаўнікамі выдавецтва “Мастацкая літаратура”.

**29 мая** ў бібліятэцы было арганізавана літаратурнае дзіцячае свята “Дзецям радасць падарыце”, прымеркаванае да Міжнароднага дня абароны дзяцей, у рамках якога адбылася сустрэча выхаванцаў ДУА “Вялікалятчанскі дзіцячы дом” з вядомым беларускім пісьменнікам, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі *Сяргеем Анатольевічам Трафімавым* “Я жыву ў Сусвеце”.

Напярэдадні Міжнароднага дня абароны дзяцей пачаў работу сайт аддзела дзіцячай літаратуры **deti.vlib.by**. Ён адрасаваны ўсім, хто

неабыякавы да чытання і кніг – юным чытачам, іх мамам і татам, бабулям і дзядулям, педагогам і выхавальнікам дашкольных устаноў.

**2 чэрвеня** ў Віцебскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы прайшло свята, прымеркаванае да Міжнароднага дня аховы дзяцей і арганізаванае супрацоўнікамі аддзела дзіцячай літаратуры.

**2 чэрвеня** адбыўся вечар памяці паэта Давіда Сімановіча і прэзентацыя яго апошняга зборніка "Дней разорванные звенья".

**5 чэрвеня** прайшоў літаратурны вечар, прысвечаны А.С. Пушкіну і прымеркаваны да 215-годдзя з дня нараджэння паэта.

**7 чэрвеня** адбылася творчая сустрэча з беларускай паэтэсай, пісьменніцай, журналісткай, літаратурным крытыкам *Людмілай Рублеўскай*.

**17** і **24 чэрвеня** супрацоўнікамі Нямецкай чытальнай залы быў праведзены занятак "Бібліятэчныя дэтэктывы" для школьнікаў СШ № 34 і СШ № 45, якія вывучаюць нямецкую мову.

**13 чэрвеня** адбылася прэзентацыя кнігі Б.А. Ганбарава "Азербайджанская диаспора в Республике Беларусь".

### *Віцебская гарадская сетка публічных бібліятэк*

**14 мая** Прэзентацыя выстаўкі вышываных работ "У гармоніі з прыродай" удзельнікаў студыі "Чароўная ніць", кіраўнік Г. Хіневіч (*бібліятэка імя Е. Лось*).

**15 мая** Сустрэча з членам Саюза пісьменнікаў Беларусі і Саюза пісьменнікаў Расіі, лаўрэатам літаратурных прэмій і дыпламантам кінафестываляў С. Трахімёнкам (г. Мінск). У праграме сустрэчы: прэзентацыя новых кніг, паказ дакументальнай стужкі "Терновые венки Олимпа" (пра заслужанага трэнера СССР Рэнальда Іванавіча Кныша), песні і рамансы на вершы І. Севяраніна, М. Шыпілава, А. Вярцінскага) (*цэнтральная бібліятэка імя М. Горкага*).

**15 мая** Творчая вечарына віцебскай паэткі Вольгі Русілкі "Я вершы не выспеўвала ніколі" (*бібліятэка імя І.А. Крылова*).



**16 мая** ў *ЦГБ імя М. Горкага* ў межах праекта "Даўгаўпілс і Віцебск: культурнае супрацоўніцтва" па праграме міжгранічных зносін "Латвія–Літва–Беларусь" прымалі дэлегацыю работнікаў культуры з г. Даўгаўпілса (Латвія). Гасцям была прапанавана экскурсія па бібліятэцы, падпісана дамова аб прафесійным супрацоўніцтве з Латгальскай цэнтральнай бібліятэкай.

**16 мая** відэападарожжа па Віцебску правёў намеснік дэкана гістарычнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава Д.В. Юрчак для навучэнцаў 10 "А" класа гімназіі № 9 (*дзіцячая бібліятэка імя А. Гайдара*).

**20 мая** ў *дзіцячай бібліятэцы імя А. Гайдара* завяршыўся праект "Вайна ў лёсе маёй сям'і", прысвечаны 70-годдзю вызвалення Беларусі. Па выніках праекта выдадзены зборнік дзіцячых апаведаў пра гісторыю сямей у гады вайны "Гордимся. Помним. Чтим".

**23 мая** наведвальнікі *ЦГБ імя М. Горкага* сталі ўдзельнікамі прэзентацыі мастацкіх выставак "Улетающие сны" члена Саюза мастакоў Беларусі *А. Пшонкі* і "Чароўны свет простых прадметаў" майстра па дэкарыраванні *Н. Махавіковай*.

**6 чэрвеня** Літаратурнае свята "Есть в мире имена, как солнце…", прысвечанае 215-годдзю з дня нараджэння А.С. Пушкіна (*бібліятэка імя А.С. Пушкіна*).

**6 чэрвеня** Свята адкрыцця летніх чытанняў "Запрашае кніжная галактыка" (*бібліятэка імя У. Караткевіча*). Удзельнікам былі прапанаваны слайд-шоу "Палёты з кнігай у сне і ўвачавідкі", мультымедыйнае падарожжа "Планета «Віцьбічы»", прысвечанае 1040-годдзю г. Віцебска, забаўляльная праграма "Віцебская азбука", музычныя і мастацкія конкурсы, гульні.

**19 чэрвеня** Літаратурнае свята "У вянок Васілю Быкаву: дзень пісьменніка ў бібліятэцы імя М. Горкага". У праграме: вечарына-партрэт "Васіль Быкаў – вялікае сэрца", кніжная выстаўка "Я раскажу вам пра вайну", прагляд мастацкай стужкі С. Лазніцы "У тумане".